народных песень гэта не датычыцца. З іншага боку, сярод жанраў народных песень ёсць лірычныя, жалобныя, сямейна-бытавыя, якія спяваюць не так ярка, напружана, эмацыянальна, але гэта залежыць ад характару і зместу песні, а геаграфічныя умовы не маюць значэння.

Некалькі слоў наконт жанравага складу песень. Цытую думку даследчыка Л.А.Малаш з кнігі "Вясельныя песні": "На поўдні Беларусі, прыродныя і геаграфічныя умовы якой спрыялі ранняму і шырокаму развіццю земляробства, склаўся і больш развіўся абрад хлеба. На поўначы, дзе пераважалі жывёлагадоўля і паляванне, а земляробствам пачалі займацца пазней шырока прадстаўлены абрады, рэаліі якіх былі звязаны з раслінным светам".

Трэба сказаць, што гэты даследчык разглядае вясельны абрад. Але гэтая заўвага агульнага параўнання жанравага складу песень поўдня і поўначы Беларусі ніяк не датычыцца. Напрыклад жніўны абрад вельмі шырока прадстаўлены як на поўдні, так і на поўначы. І гэта пры тым, што сапраўдны жніўны абрад ужо даўно не існуе. Проста народ устойліва захоўвае ў памяці жніўныя песні як яркі узор песнятворчасці.

Такім чынам, вялікай розніцы паміж жанравым складам песень поўдня і поўначы няма.

## ГУМАР ЯК НАЦЫЯНАЛЬНАЯ РЫСА У МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА (НА ПРЫКЛАДЗЕ БЕЛАРУСКІХ ПРЫПЕВАК

А.Л.Кулакоўская

Адметнае месца ў найбагацейшай скарбніцы беларускай народнай песнятворчасці займае прыпеўка. Гэта асабліва цікава таму, што як і пераважнаму прыпеўка з'яўляецца любімым у народзе фальклорным жанрам. Змястоўна і па-мастацку дасканалая прыпеўка гучна рэагуе на многія падзеі, што адбываюцца ў грамадстве і жыцці людзей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прыпеўка – аднастрофная лірычная песенька самага разнастайнага зместу, якая складаецца з чатырох, радзей шасці радкоў, па паўнаму музычнаму ўзору і выконваецца часам як прыпеў да танца. Прыпеўкі бываюць самыя розныя – любоўныя, вясельныя, сямейныя, жартоўныя і сатырычныя, прыпеўкі да скокаў і танцаў.

Любоўныя прыпеўкі – гэта творы аб узаемнасці, шчырасці і вернасці ў каханні. Сукупнасць усіх мастацкіх сродкаў, у першую чаргу памяншальна-ласкальных суфіксаў, разнастайных форм рыфмоўкі стварае ў любоўных прыпеўках пранікненны лірызм, багатую эмацыянальную насычанасць і узнятасць.

Вясельныя прыпеўкі як жанр, які паўнапраўна прысутнічае на вяселлі, захавалі цесную сувязь з абрадам. Часта блізкія па форме да вясельных рытуальных песень, яны не ілюструюць абрад, а перадаюць ацэнкі пачуццяў, якія ўзнікаюць у сувязі з такой з'явай у жыцці чалавека, як вяселле. Агульны настрой вясельных прыпевак – разважанні маладой дзяўчыны аб замужжы, неспакой перад невядомым будучым лесам.

Жанр сямейных прыпевак больш папулярны сярод моладзі – незамужніх дзяўчат і нежанатых хлапцоў. Асноўны матыў такіх прыпевак – супрацьпастаўленне жыцця ў бацькаўскім і мужавым доме. Прыпеўкі больш мінорныя, меньш лірычныя.

Жартоўныя і сатырычныя прыпеўкі найбольш распаўсюджаны. Камічнае перабольшанне, схаваная іронія, гумар ("Пайшла жыта жаць – ды забыла сярпа ўзяць") часам перарастаюць у сатыру, гратэск – асноўныя мастацкія сродкі гэтых прыпевак.

Прыпеўкі да скокаў і танцаў у сучасных запісах цікавыя перш за ўсе захаваннем вобразаў танцавальных песень, назваў музычных інструментаў, рытмікі беларускіх танцаў і іх найбольш характэрных рухаў. Танцавальныя прыпеўкі выконваюцца на шырока вядомыя мелодыі полькі, лявонікі, яблычка, сямёнаўны.

Традыцыйныя прыпеўкі маюць пераважна бытавы характар. Але ў іх заўважаюцца і сацыяльныя матывы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У адрозненні ад лірычнай песні, у якой даецца шырокая разгорнутая карціна лірычных перажыванняў, у прыпеўцы "акоплены" адзін нейкі момант, рух душы.

Тэрмін "частушка", якім часта карыстаюцца даследчыкі, запазычаны з рускай літаратуры. У народзе прыпеўкі называюцца па-рознаму: прыпевы, прыпеў, напеўкі, надскокі, надцявалкі, тарадайкі, брандушкі, брандзюшкі, бранюшкі, забаўкі, пестункі (дзіцячыя), дрындушкі, скакухі, дзяўчанкі і інш.

У сучаснай беларускай літаратурнай мове тэрмін "прыпеўка" і "частушка" ужываюцца як сінанімічныя, раўназначныя. Шматлікасць назваў прыпевак тлумачыцца жанравай асаблівасцю прыпевак, аб чым ужо была размова раней.

Бадай, ні адна з праблем фалькларыстыкі не выклікала столькі меркаванняў, думак і гіпотэз, як праблема генезісу прыпеўкі. Вылучаюцца два найбольш вострыя пытанні: калі і дзе (у якім асяродзі) ўзнікла прыпеўка? Адны вучоныя, адзначаючы непасрэдную сувязь прыпеўкі з традыцыйнай песняй, праўдзівае адлюстраванне ў ей жыцця і побыту сялянства парэформенай вескі, лічылі, што гэты жанр - вынік творчасці вясковага насельніцтва; другія, прымаючы пад увагу тое, што прыпеўка надзвычай аператыўна адлюстроўвала жыццё горада, даводзілі, што яна ўзнікла на фабрыках і заводах і таму нічога агульнага не мае з традыцыйнай вуснай паэзіяй. Тэорыі так званага фабрычна-завадскога паходжання прыпеўкі прытрымліваліся многія фалькларысты, такія як Зяленін, С.Лінева, А.Раззольскі, Г.Беларэцкі, В.Сімакоў і інш. Прыхільнікі гэтай тэорыі зыходзілі са зместу твораў; наколькі прыпеўка адлюстроўвае жыццё гарадан побыт рабочых фабрык і заводаў, іх справы і думкі, то яна, значыць і ўзнікла ў гэтым асяродзі. Але гэтая тэорыя не адказвала на самае важнае пытанне: чым выкліканы да жыцця сам жанр прыпеўкі, што абумовіла яго такую кароткую, лапідарную форму і пераважна часты рытм? Была створана яшчэ адна гіпотэза. Яны разважалі так: наколькі працоўныя песні ствараліся ў час работы і, натуральна, іх рытм складваўся пад непасрэдным уплывам працоўнага працэсу, то і рытм прыпеўкі - прамы вынік дзейнасці рабочага ля станка ці машыны. Аднак прыпеўкавы рытм не прынесены ў паэтычную творчасць звонку (ад фабрык і заводаў); яго прырода тая ж, што і песенных і музычна-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

танцавальных рытмаў, бо рытм наогул належыць да арганічных умоў і патрабаванняў фізічнага і псіхічнага складу чалавека. Дзе ж вытокі жанру прыпеўкі? Беларуская прыпеўка ў мінулым была цесна звязана з танцам і выконвалася часцей за усе як прыпеў да яго. Пра гэту сувязь сведчаць самі назвы, якія даў народ прыпеўкам у розных мясцовасцях: падскокі, скакухі, плясухі, пляcушкі, вытанкі, круцелкі і інш. Але вытокі прыпеўкі ўзыходзяць не толькі да танцавальных песенек; узоры прыпеўкавых форм знаходзім і ў гульнях-танцах, і ў карагодах, і ў вясельна-абрадавай паэзіі, і ў дударскай песнятворчасці. Ля калыскі беларускай прыпеўкі стаялі народныя музыкі-скамарохі, без якіх не праходзіла ў весцы ніводнае гулянне. Самастойнасць беларускай прыпеўкі яшчэ задоўга да Кастрычніцкай рэвалюцыі прызнавалі першыя збіральнікі і даследчыкі рускай частушкі. Больш таго, даследчыкі прызнаюць, што руская частушка мела сваю папярэдніцу - беларускую прыпеўку.

Тэматыка прыпевак змянялася, набывала рознае гучанне і адлюстроўвала сацыяльныя з'явы жыцця, якія адбываліся ў краіне. Гэта былі прыпеўкі, прысвечаныя гераічным справам савецкіх людзей, барацьба з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, а потым і пра мірную, стваральную працу людзей, пра іх клопаты і радасці. Кожная прыпеўка - гэта своеасаблівая мініяцюра. Праз маленькі штрых, дэталь ствараецца цэлы вобраз; карціна, выклікаецца неабходны настрой. Прыпеўкі бываюць самыя розныя па свайму настрою Адным з характэрных мастацкіх прыемаў прыпеўкі з'яўляецца паралелізм, прыпеўка нібы дзеліцца на дзве часткі, дзе адна з другой нібы параўнаюцца.

ДРУГАСНЫЯ КРЫНІЦЫ БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ ІНФАРМАЦЫІ ЯК СРОДАК КААРДЫНАЦЫІ ДЗЕЙНАСЦІ БІБЛІЯТЭК БЕЛАРУСІ

С.В.Зыгмантовіч
В.І.Саітава

Сярод інфармацыйных рэсурсаў рэспублікі значнае месца належыць бібліяграфіі бібліяграфіі. Уласцівыя ей мадалюючая, па-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ